способствовать личностному становлению. Но с другой, что сегодня нередко происходит, - духовно порабощать, дезинформировать, иногда не желая того, разжигать массовую ненависть, сеять недоверие и страх.

***Крол А.М.*** **Прававое забеспячэнне свабоды сумлення ў Рэспубліцы Беларусь**

Забеспячэнне рэалізацыі правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь на свабоду сумлення і веравызнання з'яўляецца адным з ключавых элементаў забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Канфесійная прастора Беларусі з'яўляецца гетэрагеннай. Сёння ў Беларусі зарэгістравана больш за 3 тысячы рэлігійных арганізацый, большасць – хрысціянскія, менш за 3% – нехрысціянскія (іўдзеі, мусульмане, крышнаіты, бахаі). У структуры ідэнтыфікацыі пераважае этнаканфесійны фактар: грамадзяне звязваюць феномен рэлігіі з этнічнай культурай і традыцыямі, лічачы, што рэлігія выконвае светапоглядную і сацыяльна-рэгулятыўную функцыі. Такі погляд робіць забеспячэнне правоў грамадзян у дадзенай вобласці яшчэ больш значным. Асновы для рэалізацыі правоў грамадзян у галіне свабоды сумлення і веравызнання закладзены ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Законе "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях" (2002 г.). Згодна з артыкулам 4 Канстытуцыі, ідэалогія рэлігійных аб'яднанняў не можа ўсталёўвацца ў якасці абавязковай для грамадзян. Норма артыкула 31 Канстытуцыі гарантуе свабоду сумлення і тлумачыць яе як права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі; аднаму або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай. Свабода сумлення з'яўляецца найважнейшым фундаментальным правам чалавека.

У Законе Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях" правы на свабоду сумлення і на свабоду веравызнання атрымалі дэталёвую рэгламентацыю. У прыватнасці, у артыкуле 3 Закона тэрмін "веравызнанне" вызначаецца як "распрацаванае веравучэнне, якое належыць якой-небудзь рэлігіі з традыцыйнай культавай практыкай", а ў артыкуле 5 раскрываецца права на свабоду веравызнання: "Кожны мае права свабодна выбіраць, мець, мяняць, выказваць і распаўсюджваць рэлігійныя

перакананні і дзейнічаць у адпаведнасці з імі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам. Ніхто не абавязаны паведамляць пра сваё стаўленне да рэлігіі і не можа падвяргацца якому-небудзь прымусу пры вызначэнні свайго стаўлення да рэлігіі, да вызнання той ці іншай рэлігіі, да ўдзелу ці няўдзелу ў дзейнасці рэлігійных арганізацый.

Бацькі або асобы, якія іх замяняюць, па ўзаемнай згодзе маюць права выхоўваць сваіх дзяцей у адпаведнасці са сваім уласным стаўленнем да рэлігіі. Дзяржава не можа ўмешвацца ў выхаванне дзяцей, заснаванае на пэўным рэлігійным светапоглядзе бацькоў або асоб, якія іх замяняюць, за выключэннем выпадкаў, калі прымус да рэлігійных дзеянняў пагражае непасрэдна жыццю або здароўю дзіцяці, парушае яго законныя правы". Культураўтвараючымі для Беларусі прызнаныя ў дадзеным выпадку пяць рэлігій: праваслаўе, каталіцызм, лютэранства, іўдаізм і іслам. Зразумела, вернікам, якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, гарантавана права вызнаваць сваю веру. Аднак нельга забываць і пра абавязкі перад грамадствам і дзяржавай. У частцы 4 артыкула 7 Закона замацавана, што ніхто не можа па матывах сваіх рэлігійных перакананняў ухіляцца ад выканання ўстаноўленых законам абавязкаў. На выкананне такога абавязку з боку праваслаўных вернікаў паказваецца і ў Асновах сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы. Згодна з артыкулам 16 Канстытуцыі забаронена дзейнасць рэлігійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, якія накіраваны супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды ці звязаны з парушэннем правоў і свабод грамадзян, а таксама перашкаджаюць выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў або прычыняюць шкоду іх здароўю і маральнасці (частка 3). Такім чынам, Закон зыходзіць з разумення таго, што дзяржава – гэта адзіная нарматыўная інстанцыя для ўсіх канфесій, якая стварае ўмовы для іх нармальнай дзейнасці.

У Беларусі дзейнічае дзяржаўны апарат па справах рэлігій і нацыянальнасцей, функцыяй якога з'яўляецца каардынацыя дзейнасці рэгіянальных органаў па справах рэлігій, аказанне ім кансультацыйнай (у тым ліку рэлігіязнаўчай і прававой) дапамогі, кантроль за выкананнем заканадаўства аб свабодзе сумлення і статутнай дзейнасцю рэлігійных арганізацый. Сёння ў сферы

абароны свабоды сумлення і веравызнання можна вылучыць тры блокі праблем. Першы і найбольш актуальны – рэалізацыя правоў непаўналетніх на свабоду сумлення і веравызнання ва ўстановах адукацыі. Дзяржаўная сістэма адукацыі ў Беларусі носіць свецкі характар. Ва ўстановах адукацыі не дапускаецца стварэнне, а таксама ананімная (або іншая супрацьзаконная) дзейнасць рэлігійных арганізацый. Установы адукацыі могуць узаемадзейнічаць з рэлігійнымі арганізацыямі толькі ў пытаннях выхаваўчай дзейнасці. Такое ўзаемадзеянне ажыццяўляецца на падставе пісьмовых заяў бацькоў або асоб, якія іх замяняюць, у пазавучэбны час. У сістэме адукацыі краіны дадзенае становішча кантралюецца на ўсіх узроўнях. Дарослыя і дзеці маюць магчымасць рэлігійнага навучання ў створанных рэлігійнымі арганізацыямі навучальных групах і нядзельных рэлігійных школах. У Беларусі вядзецца праца па тлумачэнні палажэнняў заканадаўства ва ўстановах сістэмы адукацыі. Школьныя або студэнцкія аўдыторыі з’яўляюцца поліканфесійнымі, задача педагогаў – фарміраваць каштоўнасці верацярпімасці.

У 2007 г. былі распрацаваны і прапанаваны краінам рэгіёну АБСЕ “Кіруючыя прынцыпы выкладання рэлігій і вераванняў у грамадскіх школах” (т. зв. “Таледскія прынцыпы”). Таледскія прынцыпы заяўляюць пра неабходнасць змагання з дыскрымінацыяй, прадугледжваюць захаванне навуковага ўзроўню выкладання, кампетэнтнасці выкладчыкаў; захаванне свабоды сумлення і веравызнання ў адносінах настаўнік–вучань і ў асяроддзі навучэнцаў; улік уплыву на дзяцей сям’і і рэлігійных арганізацый.

Таледскія прынцыпы падкрэсліваюць, што навучанне павінна адбывацца ў поўнай адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі па якасных навучальных праграмах і планах, якія павінны ўлічваць культурную і рэлігійную разнастайнасць у грамадстве, міжнародны вопыт у выкананні правоў чалавека. Таледскія прынцыпы надзвычай важныя для Беларусі ў сілу яе поліканфесійнай культурнай прасторы. Другі блок праблем – прафілактыка правапарушэнняў, матываваных рэлігійнай непрыязнасцю. Трэці блок праблем звязаны з абаронай правоў вернікаў на фоне рэлігійных абмежаванняў іх сацыяльнай дзейнасці. Такім чынам, сучаснае заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях сцвярджае прынцып свабоды сумлення і,

разам з гэтым, прызнае ўплыў некаторых канфесій на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа, што выклікае неабходнасць будаўніцтва з імі добрых адносін шляхам заключэння спецыяльных пагадненняў. Дадзеная практыка з'яўляецца новай для Беларусі, але шырока выкарыстоўваецца ў шэрагу іншых краін Еўропы і адпавядае адной з заходнееўрапейскіх мадэлей дзяржаўна-канфесійных адносін. Практычнае ўвасабленне норм Канстытуцыі і іншых прававых актаў аб свабодзе сумлення шмат у чым залежыць ад канкрэтнай дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання, у тым ліку на рэгіянальным і мясцовым узроўнях. І, зразумела, ад ступені ўсведамлення грамадствам значнасці свабоды сумлення і свабоды рэлігіі ў сістэме правоў і свабод чалавека.

***Москаленко М.Р., Кропанева Е.М.*** **К вопросу об идеале достойного человеческого существования в христианской традиции**

В настоящее время происходит переосмысление места и роли религии в обществе. После значительного ослабления влияния «мировых идеологий» (коммунизм, либерализм) люди в России и Европе все чаще обращаются к христианству и иным религиям для решения экзистенциальных проблем, связанных с мировоззренческими вопросами смысла и цели жизни. И один из таких вопросов – это чувство собственного достоинства и достойное существование человека.

Сейчас во многих государствах достойное существование граждан стало значимым идеалом общественного развития. Само определение достойного человеческого существования имеет, по большому счету, два аспекта: 1) уровень и качество жизни людей, обеспеченность реализации их прав и свобод, социально-экономических гарантий; 2) внутреннее мироощущение человека, включающее в себя самоуважение и определенные моральные качества.

Науки социально-экономического плана позволяют составить всевозможные рейтинги, оценивающие уровень и качество жизни людей, но ознакомление с их данными (а в современном постиндустриальном обществе эти данные, во-первых,